# РАБОТА З ТЭКСТЫЛЬНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ
## частка 2

Сячкоўская Лідзія Рыгораўна,
старшы выкладчык кафедры спецыяльнай педагогікі

# ПЛАН ЗАНЯТКАЎ :

1. Інструменты і прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца пры працы з тэкстыльнымі матэрыяламі
2. Прыстасаванні для захоўвання матэрыялаў і інструментаў

# Інструменты і прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца пры працы з тэкстыльнымі матэрыяламі

| Назва інструмента | Прызначэнне і характарыстыка інструмента | Патрабаванні па ўжыванні |
|---|---|---|
| Нажніцы | Для навучэнцаў пачатковых класаў найбольш падыходзяць гаспадарчыя нажніцы даўжынёй ад 110 да 170 мм<br>Для раскрою розных тканін выкарыстоўваюцца таксама кравецкія нажніцы | Выкарыстоўваюць для працы нажніцы з плыўным, распрацаваным ходам і трывалым злучэннем паловак. Лязы нажніц павінны быць добра завостраныя |
| Швейныя ручныя іголкі | Выпускаюць ад № 1 да № 12. У залежнасці ад нумара змяняецца даўжыня і дыяметр іголак. Іголка № 1 мае даўжыню 35 мм, дыяметр 0,6 мм; іголка № 12 – даўжыню 70 мм, дыяметр 1,8 мм<br>Для вышыўкі выпускаюць адмысловыя іголкі, вушка і адтуліна ў вушцы і якіх значна | Іголку падбіраюць у залежнасці ад тканіны і таўшчыні нітак. Тонкія тканіны шыюць тонкімі іголкамі і ніткамі.<br>Для першых работ выкарыстоўваюць іголкі вялікіх памераў, у іх лягчэй навучыцца ўсоўваць ніткі |

# Інструменты і прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца пры працы з тэкстыльнымі матэрыяламі

| Назва інструмента | Прызначэнне і характарыстыка інструмента | Патрабаванні па ўжыванні |
|---|---|---|
| Напарстак | Выкарыстоўваецца пры пракалванні тканіны іголкай і праштурхоўванні іголкі праз матэрыял. Засцерагае палец ад уколаў вушкам іголкі. Напарсткі бываюць металічныя і пласмасавыя | Падбіраецца напарстак на сярэдні палец правай рукі ў залежнасці ад таўшчыні пальца, каб ён не быў прасторным і не ціснуў на палец |
| Сантыметровая стужка | Выкарыстоўваецца для зняцця мерак, адмервання цясьмы, стужкі і інш., вымярэння скроеных дэталяў, выкраек | Не павінна мець пашкоджанняў у выглядзе надрываў, пацёртасцей |
| Лінейка і вугольнік | Выкарыстоўваюцца для складання найпростых выкраек невялікіх памераў прамавугольнай формы | Веданне правілаў разметкі з дапамогай чарцежна-вымяральных інструментаў |

# Інструменты і прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца пры працы з тэкстыльнымі матэрыяламі

| Назва інструмента | Прызначэнне і характарыстыка інструмента | Патрабаванні па ўжыванні |
|---|---|---|
| Кравецкія шпількі | Выкарыстоўваюцца пры разметцы тканіны для прымацавання выкрайкі, для сколвання дэталяў пры зметванні | Захоўваць толькі ў ігольніцах і карыстацца шпількамі варта пад наглядам дарослых |
| Швейны мел | Служыць для нанясення ліній на тканіну па выкрайцы і шаблонах.<br>Для гэтай жа мэты выкарыстоўваюць невялікія кавалачкі высушанага мыла і алоўкі | Не дапускаць моцных механічных уздзеянняў, udaраў, пры якіх мел можа раскрышыцца. Патрэбна прывучаць дзяцей да акуратнасці |
| Маталкі для нітак | Выкарыстоўваюцца для адматвання патрэбнай (невялікай) колькасці нітак, каб не прыносіць вялікія шпулькі, скруткі і клубкі | Самаробныя прыстасаванні, вырабляюцца з кардону. Маюць розную форму |

# Інструменты і прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца пры працы з тэкстыльнымі матэрыяламі

| Назва інструмента | Прызначэнне і характарыстыка інструмента | Патрабаванні па ўжыванні |
|---|---|---|
| Ніткаўвадзіцель | Выкарыстоўваецца для працягвання ніткі ў адтуліну ў вушцы іголкі | Ніткаўвадзіцель ўстаўляецца ў адтуліну ў вушцы іголкі, у яго ўсоўваецца нітка. Затым ніткаўвадзіцель працягваецца праз адтуліну ў вушцы, захапляючы за сабой нітку |
| Калька | Выкарыстоўваецца для перакладу малюнка на тканіну | Накладваецца калька пастай ўніз на выпрасаваную тканіну на месца будучай вышыўкі. Вострым алоўкам акуратна абводзіцца контур малюнка |
| Калок, шыла | Калок- доўгая драўляная або металічная палачка дыяметрам каля 5 мм з вострым канцом | Калком праколваецца тканіна, рассоўваючы ніткі так, каб не парушыць яго структуру. З яго дапамогай можна выдаляць намёткі.<br>У працы з тоўстымі матэрыяламі: сукном, лямцом, скурай – ужываецца шыла |

# Прыстасаванні для захоўвання матэрыялаў і інструментаў

| Назва інструмента | Прыстасаванне для захоўвання |
| --- | --- |
| Нажніцы | Футляр з цыраты, шчыльнай тканіны, кардона і інш. |
| Іголкі і шпількі | Игольніцы-кніжачкі або падушачкі |
| Матэрыялы і прылады | Папка-гатавальня (на падставе канцылярскай папкі)<br>Мяшочак для рукадзелля і шыцця з тканіны<br>Скрынка для рукадзелля з кардона<br>Шкатулка для рукадзелля і шыцця |

# Литература


1. Букач, Л. А. Материаловедение и технология ручной вышивки : учеб. пособие / Л. А. Букач, М. А. Ровнейко. – Минск : Респ. ин-т проф. образования, 2015. – 327 с.
2. Власова, А. А. Уроки рукоделия / А. А. Власова. – СПб. : Корона принт, Кристалл, 1998. – 400 с.
3. Выгонов, В.В. Практикум по трудовому обучению: Учеб. пособие для студ. высш. и сред. пед. учеб. заведений/ В.В.Выгонов. – М.: Изд. центр «Академия», 1999. – 256 с., 12 л. ил: ил.
4. Гукасова, А.М. Методика трудового обучения /А.М. Гукасова. – М.: Просвещение, 1990. – 207 с.
5. Кузнецов, В.П. , Рожнёв, Я.А. Методика трудового обучения с практикумом в учебных мастерских / В.П. Кузнецов. – М.: Просвещение, 1981.
6. Рукоделие для детей / Калинич М., Павловская Л., Савиных В. – Мн.: Полымя, 1997. – 201 с.: ил.
7. Цейтлин, Н.Е., Демидова, А.П. Справочник по трудовому обучению: Пособие для учителя/ Н.Е.Цейтлин. – М.: Просвещение, 1983. – 288 с.: ил.